лася касцяное дзяржанне. На ім награвіраваны княжацкі знак — трызубец. Па чэрапе з гэтага курганнага могільніка кандыдат гістарычных навук І. У. Чаквін зрабіў рэканструкцыю твару дружынніка-палачаніна, а скульптар Я. П. Яшэнка выканаў яго скульптурную выяву.

Курган 3 дыяметрам 10 м, вышынёй звыш за 2 м. Здавалася, курган добра захаваўся і не пашкоджаны. Іншае выявілася пры раскопках. У вяршыні знойдзены асобныя косці чалавека. На глыбіні 1,5 м выяўлены дзве кучы чалавечых касцей і 15 чарапоў. Напэўна, у старажытным кургане намнога пазней былі закапаны забітыя ў час вайны жыхары Лукомля.

Курган 4. У насыпе знойдзены перамешаныя косці чалавека і каваны цвік. Курган раней быў перарэзаны траншэяй.

У 1888 г. Е. Р. Раманаў адзначыў яшчэ 2 курганы ў ваколіцах Лукомля.

Курган 1 — за 1 км на Пн ад апісанага курганнага могільніка на сядзібе селяніна, другі — самы вялікі ў Лукомлі — на такой жа адлегласці на З. Першы з гэтых курганоў захаваўся да 1956 г. і быў скапаны.

Курган 2. Вялікі курган-«валатоўка» захаваўся да нашага часу каля сучасных могілак, на правым беразе Лукомкі. Ён правільнай паўсферычнай формы. Дыяметр 20 м, вышыня звыш 4 м. Не даследаваўся.

У 1966 г. знойдзены яшчэ адзін курган-«валатоўка» сярод хмызняку на левым беразе Лукомкі. Знойдзена ляпная і кругавая кераміка, на глыбіні 0,5 м — шыфернае прасліца. У кургане на розных узроўнях выяўлена некалькі шкілетаў.

*Пачаевічы.* Ля в. Пачаевічы за 0,5 км на Пд курганны могільнік з 7 курганоў вышынёй 0,9—2,65 м, дыяметрам 4—15 м. Насыпы пясчаныя, здзірванелыя. Раскопкі не праводзіліся.

*Рыжанкі.* Ля в. Рыжанкі 2 курганныя могільнікі.

Могільнік 1 знаходзіцца за 2,5 км на ПнУ ад вёскі, на правым беразе р. Усвейка, у лесе, ва ўрочышчы Бор. 2 насыпы вышынёй 2,1 м, дыяметрам 10 і 12 м. Курганы добра захаваліся, зараслі лесам, каля іх асновы прасочаны раўкі глыбінёй 0,5 м. Раскопкі не праводзіліся.

Могільнік 2. Мясцовая назва Французскія, ці Напалеонаўскія, магілы. Знаходзіцца за 2,5 км на Пн ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Воранава, на правым беразе р. Усвейка. 3 насыпы вышынёй 2,5 м, дыяметрам 10—12 м. Курганы пашкоджаны ямамі, зараслі лесам. Раскопкі не праводзіліся.

*Сіманавічы.* Ля в. Сіманавічы курганны могільнік і курган.

Мясцовая назва могільніка Валатоўкі. Размешчаны за 1 км на З ад вёскі, на ўскрайку лесу, абапал дарогі на в. Стаўбцы, ва ўрочышчы Валатоўкі. 6 насыпаў вышынёй 0,5—1,5 м, дыяметрам каля 15 м. Захаванасць добрая, за выключэннем 2 курганоў. Раскопкі не праводзіліся.

Курган за 2,5 км на З ад вёскі, у лесе, злева ад дарогі на в. Стаўбцы. Вышыня 1,3 м, дыяметр 10 м. Добра захаваўся, зарос лесам, вакол яго асновы прасочаны невялікі равок глыбінёй 0,3 м.

*Слабодка.* 3 курганныя могільнікі з агульнай колькасцю 143 курганы, размешчаны ля в. Слабодка Лукомскага сельсавета, за 5—7 км ад Лукомля. Выявіў у 1976 г. і даследаваў насыпы ў 1967, 1969 і 1971 гг. Г. В. Штыхаў.

Першы курганны могільнік за 1,5 км на З ад вёскі. Налічвае 105 круглых у плане насыпаў вышынёй 0,5—2,5 м. Адзін курган вызначаўся вялікімі памерамі і дасягаў у вышыню 3 м. Курганы знаходзяцца на паўночным узвышаным беразе воз. Лукомскае, цягнуцца паласой на 400 м уздоўж берага і называюцца валатоўкамі.

Курган 1 дыяметрам 8 м, вышынёй 0,9 м. Знойдзены перамешаныя косці, побач абвугленае бервяно. У кучцы выяўлены 4 двайныя лімонападобныя жоўтыя пацеркі, адна лімонка трайная,